

Газета для вас

ІВАЦЭВІЧЫ–БАРАНАВІЧЫ-БЯРОЗА-ПРУЖАНЫ

№47 (258) 24 — 30 лістапада 2000 г. | ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ НЕЗАЛЕЖНЫ ШТОТЫДНЁВІК, ВЫХОДЗІЦЬ СА СТУДЗЕНЯ 1997г.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:



ЯШЧЭ НА ЛЯНОК НЕ ЎПАЎ СНЯЖОК

Але хутка, магчыма, ляжа, бо ўсе прыродныя падарункі калі-небудзь заканчваюцца, а па даных шматгадовых назіранняў сіноптыкаў на канец лістапада можа быць тэмпература ў межах 25 градусаў. Ніжэй нуля, зразумела.

У гаспадарках Івацэвіччыны, пераважна ў так званай касаўскай зоне, яшчэ на палях работы хапае. Асабліва здзіўляе тое, што лён у калгасах "Савецкая Беларусь", "Косава", імя Леніна, "Бальшавік" яшчэ ў большасці ляжыць на зямлі. Застаецца думаць, што наша сельгасупраўленне заключыла дамову з "нябеснай канцылярыяй", каб тая дазволіла завяршыць усе работы. І тыя сродкі, якія дзяржава і мы, падаткаплацельшчыкі, штогод "убухваем" у калгасна-саўгасную сістэму, не загадаюць доўга жыць.

А што кажуць спецыялісты вышэйзгаданых гаспадарак? У калгасе "Косава" нам патлумачылі, што работы засталося ці то на адзін дзень (дыспетчарская), ці то на некалькі дзён (бухгалтэрыя). Аптымісты! Да работы тут прыцягваліся работнікі мясцовага Косаўскага МВА, Квасевіцкай фабрыкі пуху і пер'я.

У калгасе "Савецкая Беларусь" таксама яшчэ шмат лёну не ўбрана (на здымку), работы таксама на "некалькі дзён", паведаміў старшыня калгаса. На льняным полі, калі наш рэдакцыйны аўтамабіль пад'ехаў, завіхаліся ўкраінцы. Па іх словах, мясцовая "алкашня" працаваць не жадае. Больш, быццам, аптымістычны настрой у калгасе імя Леніна, хоць сюды прыязджалі працаваць і з "Івацэвічдрэў", і нават з Дома Саветаў. Але калгас мае праблемы з гаручым, таму невядома калі гэты лён вывезуць.

Можа здарыцца так, што цярпенне "нябеснай канцылярыі" лопне і тады па льняных палетках ужо трэба будзе пускаць снегаўборачныя агрэгаты.

Аляксандр МІХАЛЕНКА.

Фестываль незалежнай прэсы

17—18 лістапада ў Мінску праходзіў I фестываль незалежнай прэсы. На фестывалі былі прадстаўлены больш за 60 незалежных газетаў, якія зараз выдаюцца ў Беларусі, у тым ліку і "Газета для вас".

Адбылася прэзентацыя газетаў, уручэнне прызоў, размова аб праблемах свабоды слова і незалежнай прэсы ў Беларусі.

Ёсць спадзяванні, што нават у сённяшніх неспрыяльных умовах незалежныя газеты выжывуць і нават будуць развівацца далей.

Пахвалімся: "Газета для вас" таксама атрымала прыз фестываля.

Лідзія ЦАЛУЙКА.

Вечернее нападение

БАРАНОВИЧИ. Было совсем не поздно, когда хозяйка квартиры, расположенной в центре города, вернулась домой, где застала жуткую картину. Её сын, пятиклассник, лежал на полу без сознания. Позже, в больнице, будет установлено, что ребенка душили. Еще позже хозяйка выяснит, что пропала приличная сумма денег, золото.

Будем надеяться, что эти два подонка не уйдут от возмездия.

Разврат по самым низким ценам

обещают расклеенные по Барановичам абъявления. Некий салон "Надежда", занимающийся тайским массажем, гарантирует комплекс услуг для богатых и сексуальных.

В объявлении все чин чином — номер лицензии, номера телефонов и полный адрес салона.

Верить ли глазам своим? И есть ли глаза у властей?

Галина СТРОЦКАЯ.

Памяці майстра

ПРУЖАНЫ. У музеі-сядзібе "Пружанскі палацык" адкрылася выстава памяці цудоўнага брэсцкага мастака Мікалая Дзмітрыевіча Чурабы.

Алесь САШЫН.

● ЧАС РЭСПУБЛІКІ

Учителя требуют

72 тысячи подписей собрано в поддержку требований, которые содержатся в заявлении работников сферы образования и науки Минска.

Суть этого документа сводится к тяжелой ситуации, сложившейся в сфере образования. "Вся политика нашего государства", говорится в нем, основана только на "обостренном чувстве долга" работников сферы образования "перед детьми, обществом и будущим страны". "Финансируя наши сады, ясли, школы, высшие учебные заведения по остаточному принципу, власти постоянно нам твердят, что... для нас аморально покидать наши рабочие места в знак протеста", - отмечается в заявлении. В ответ на это педагоги заявляют: "Безнравственно доводить уровень нашей зарплаты до 46 процентов от средней в промышленности... Нет будущего у общества, в котором милицейский сержант получает зарплату больше учителя и даже профессора".

Работники сферы образования требуют от властей выполнения в полном объеме закона "Об образовании Республики Беларусь", программы "Учитель", а также обещаний, данных на апрельском съезде профсоюза. "Если наши требования не будут выполнены до конца 2000 года, мы снимает с себя все нравственные обязательства перед обществом, и оставляем за собой право защищать наши интересы всеми законными способами и средствами", - говорится в заявлении.

Осень музыкальная

20 ноября в Брестской области открылся фестиваль искусств "Белорусская музыкальная осень".

В фестивальные дни поклонников музыки своим искусством порадуют народный артист Беларуси, пианист Игорь Оловников, вокалистка Гомельской областной филармонии Тамара Сапегина, баянист Белгосфилармонии Александр Мацкевич, октет балалаек Витебской областной филармонии, ансамбль народных инструментов Брестской областной филармонии, народный артист Беларуси, композитор Игорь Лученок. Все они выступят в Каменецком, Пружанском, Брестском, Малоритском, Кобринском районах области, а также в Пинске, Иваново, Дрогичине.

Серию представлений в ряде районов Брестчины даст Московский цирк. В рамках фестиваля, 24 ноября в Бресте, состоится концерт группы "Земфира", 25-го, в Барановичах, выступит известный российский дуэт - Илья Олейников и Юрий Стоянов, а на 26 ноября запланирована программа "Вино-Шоу-Кур" с участием народного артиста России Владимира Винокура. Фестиваль "Белорусская музыкальная осень" завершится 3 декабря.

Мало было информации

В ходе общенационального опроса, проведенного в октябре 2000 года представителями Независимого института социально-экономических и политических исследований, жителям Беларуси прелагалось ответить на вопрос: располагали ли они достаточной информацией о претендентах на депутатский мандат, которые баллотировались 15 октября по их избирательному округу, а также о предвыборных программах этих кандидатов в депутаты.

Участие в опросе приняли 1.460 жителей страны 16 лет и старше. Большинство из них - 65 процентов - ответили, что не располагали информацией о кандидатах и их программах. Вместе с тем 32 процента респондентов заявили, что они располагали достаточной информацией. Остальные 3 процента не ответили на предложенный вопрос.

Тормозят расследование

Зинаида Гончар, супруга пропавшего без вести 16 сентября 1999 года оппозиционного политика Виктора Гончара, прокомментировала в беседе с корреспондентом БелаПАН анонимное сообщение о судьбе исчезнувших Дмитрия Завадского и Виктора Гончара.

Зинаида Гончар сказала, что не хочет верить этой информации, прячет ее текст от сына. "Пошел второй год, как пропал Виктор Гончар. Какие у меня в голове могут быть мысли?" - сказала супруга политика. И раньше она получала различные сообщения так называемых "доброжелателей" о судьбе своего мужа, но, по ее словам, если все выслушивать, то можно сойти с ума. "Об этом надо не у меня спрашивать, а у властей и следователей - что они делают, чтобы найти пропавших", - сказала Зинаида Гончар.

Следователь прокуратуры города Минска Сергей Новиков, который ведет расследование и с которым Зинаида Гончар общалась более месяца назад, сказал, что следствие зашло в тупик. "Но у нас следствие может зайти в тупик только по одной причине - когда это касается высокопоставленных лиц", - считает Зинаида Гончар.

(БелаПАН).

● ВЫБАРЫ — 2000

Будзем есці "свірыдаўскі" хлеб?

Вось і прайшлі выбары. Ці ёсць сэнс успамінаць пра іх? У так званую Палату выбраны ўдачлівыя людзі. І сцяг ім у рукі.

Мне ж хацелася сказаць колькі слоў пра тых людзей, якія імкнуліся стаць дэпутатамі ад Івацэвіцкай выбарчай акругі.

У другі тур выбараў выйшлі Ф. Клюкач і А. Свірыд. Апошняга ў нашым раёне не ведаў ніхто, аднак ён стаў дэпутатам. Ф. Клюкач мае дачыненне да Івацэвічаў толькі адным — ён займае крэсла загадчыка аддзела па працы ў аблвыканкаме. Што ён зрабіў для стварэння рабочых месц у Івацэвічах? Мяркую, што простым людзям гэта невядома.

Адна мая знаёмая (шматдзетная, беспрацоўная) кабета ў роспачы папрасіла парады ў таварыша Ф. Клюкача. Дык паважаны спадар параіў ёй ездзіць у суседнюю Польшчу на заробкі (кінуць дзяцей і ехаць падымаць чужую эканоміку?). А на пытанне, ці не заняцца сваім бізнесам або фермерствам, параіў адмовіцца ад гэтай ідэі, калі няма сваіх сродкаў, не чакаць падтрымкі ад дзяржавы. Вось такая парада загадчыка аддзела па працы.

Шчодрым аказаўся на абяцанні А. Свірыд. Ён паабяцаў "выбіць" сродкі на заканчэнне будаўніцтва хлебазавода і будаўніцтва новай бальніцы. Ну, што ж ён аказаўся больш ініцыятыўным спадаром. Будзем спадзявацца, што давер народа будзе апраўданы. Ва ўсім ёсць свае плюсы. Мо, сапраўды хутка будзем есці "свірыдаўскі" хлеб і лячыцца ў новай, прасторнай "свірыдаўскай" бальніцы. Хутчэй бы.

Ала ТАЛСТАЯ.
г. Івацэвічы.

● ПОСЛЕ СОБЫТИЯ

САММИТ ДЕТЕЙ

В Минске состоялся Саммит детей Беларуси. Организаторами его проведения выступил Союз молодежных и детских общественных объединений "Белорусский национальный молодёжный совет" и отделение регионального представительства ЮНИСЕФ, которое поддерживает программы и проекты, разработанные совместно с правительственными и общественными организациями. Участниками Саммита стали самые инициативные ребята, по 15 человек от каждой области Беларуси.

Были на Саммите и представители от г. Берёзы: Роман Чумачёв, клуб "Инициатива" СШ № 1, Миша Пашкевич — СШ № 2 и Андрей Беловежкин — СШ № 3 — совместный клуб археологов. Провели ребята на Саммите, наверное, одни из самых незабываемых каникул в своей жизни.

Интересные, инициативные ребята со всего государства, продуманная программа, ролевые игры, интеллектуальные игры, общение с представителями законодательной власти и ООН — всё это позволило высказать свои мысли, чему-то научиться, поспорить, очертить существующие проблемы и искать сообща пути их решения. Один из дней Саммита ребята работали за круглым столом с участием представителей законодательной и исполнительной органов власти, республиканских общественных объединений, СМИ, ЮНИСЕФ. В результате были определены "Рекомендации в национальный доклад". Много интересных идей и мыслей появилось у ребят после того, как поработали они в группах. Кстати, на Саммите были представители самых разных детских инициатив — это и скауты, и гайды, и представители Польской Громады. Звучали горячие выступления с трибуны. Волнуют ребят такие проблемы, как невозможность самим зарабатывать деньги, как практикуется это во многих странах; замкнутость, оторванность от общества детей-инвалидов, увеличение числа детей, живущих в государственных интернатных учреждениях и т. д.

Поближе познакомились ребята с молодёжным движением "Некет-Стоп-Нью Лайф!", которое уже давно занимается поддержкой и развитием молодёжных инициатив в различных сферах деятельности (культурной, образовательной, экологической, социальной). Цель этого молодёжного движения — возможность самореализации и реализации идей вообще.

Информационным центром Саммита был выпущен специальный выпуск "Глобальное движение в интересах детей", где можно познакомиться с лучшими детскими инициативами Беларуси.

Ну, а наши березовские ребята полны энтузиазма, инициативы, желания делать, творить, что-то менять, а главное — не стоять на месте.

Ирина МИНЕЕВА.
г. Береза.

● ВЫСТАВЫ

Грашовая гісторыя раёна

БЯРОЗА. Цяжка нават падлічыць колькі разоў за ўвесь час існавання нашу зямлю далучалі да тых ці іншых краін, колькі змянілася ўладаў. Але кожная з іх уводзіла свае законы, грашовыя адзінкі, чым пакінула адметны след у нашай гісторыі.

Нядаўна Белаазёрскі маладзёжны клуб калекцыянераў падрыхтаваў пераcоўную выставу "Гісторыя Бярозаўшчыны ў манетах, банкнотах і паштовых марках". Усе гэтыя рэчы, сабраныя юнымі калекцыянерамі і размешчаныя ў экспазіцыях, у той ці іншы час выкарыстоўваліся на нашай тэрыторыі ў якасці сродкаў плацяжу. Выстава сапраўды атрымалася цікавай і прадстаўляе інтарэс не толькі для спецыялістаў і нумізматаў, але і для звычайных наведвальнікаў. Зараз яна дэманструецца ў Белаазёрскім ПТВ-82, на чарзе - мясцовыя школы.

Мікола СІНКЕВІЧ.

☎ АЛЁ, РЭДАКЦЫЯ?

"Не хоча ехаць "хуткая дапамога"...

— "Хочам расказаць на старонках вашага выдання аб тым, як нас "кінулі" супрацоўнікі нашага Івацэвіцкага РТМА. У майго блізкага сваяка приступ гемарою, ён не можа нават рухацца. Калі мы патэлефанавалі па 03, то нам (не вельмі карэктна, дарэчы) пачалі тлумачыць, што "хуткая" выязджае толькі ў экстрэнных выпадках — калі хто-небудзь раджае або памірае. Бензін, маўляў, зараз дарагі. Так і не прыехалі. Як мне падаецца, памерці можна і без іх удзелу, але вось чаму гэты размаляваны аўтамабіль з вялікімі лічбамі 03 я так часта бачу каля сваёй дачы?..

Данута РУСЕНКА, г.Івацэвічы .

На пытанне Дануты Мечыславаўны адказвае намеснік галоўнага ўрача Івацэвіцкага РТМА Віктар БАРЫСЕВІЧ:

— "Хуткая" не прыехала — і правільна зрабіла. Калі вас турбуе хвароба накшталт вышэйзгаданага гемарою, вы не можаце рухацца, то выклікаць трэба ўчастковага ўрача, які назначыць лячэнне. Для гэтага патэлефануйце ў рэгістратуру. Калі справы ў хворага, насамрэч, не вельмі добрыя, то вас чакае хірург або дзяжурны ўрач.

"Хуткая дапамога" прыедзе тады, калі вы маеце праблемы з дзіцём да трох год, калі адбыўся няшчасны выпадак, трагедыя, аварыя, здарэнне — і адпаведна траўмы, калецтва, сутаргі, атручэнне арганізма, інфаркт і г. д. Абавязкова выязджаем да цяжарных жанчын. У астатніх выпадках хворы павінен сам трапіць на прыём.

Такая сітуацыя — не па прычыне нашай абыякавасці ці раўнадушша да хворага чалавека. Такія ўмовы дыктуюцца канкрэтнай эканамічнай сітуацыяй...

● РЫНКАВАЯ ПЛОШЧА

ШТО ПАЧЫМ?

Цэны на рынках нашага рэгіёна па стану на 22.11.2000 г. (у руб. за адзін кілаграм):

	Івацэвічы	Баранавічы	Бяроза	Пружаны
Свініна	2100—2700	2100—3000	2200—2600	2000—2800
Сала салёнае	1800	1800—2400	2400	2300
Алей (1 л)	680—1050	700—1100	660—1000	660—950
Яйкі	740	800—1000	750	900
Малако (3 л)	600	500	540	420
Тварог	600	550	700	700
Масла сметанк.	1800	1900	2000	1800
Бульба	80—100	100—120	80	80
Цыбуля	250	120—160	150—200	200
Морква	200	80—100	180	200
Капуста	80—90	80—100	100	80—100
Грушы	—	600—1000	200—400	150
Буракі	60—80	60—80	60—80	80
Мандарыны	1500	1500	1500	1500
Грэцкія арэхі	1000	1500	1500	1000
Яблыкі	250—300	200—750	200—300	200—300
Памідоры	800	700—800	500—600	500—650
Вінаград	1000—2200	900—1800	1600	1700
Кавуны	—	160—200	200	—
Часнок	800	800	1000	500—800
Лімоны	1300	1100—1300	1300	1300
Апельсіны	650—850	650—720	790	900
Бананы	650—850	650—720	790	900
Гранаты	1600—1800	1800	1600	1600
Грэчка	600—660	650	650	780
Макар. вырабы	320—460	300—400	510—550	370—600
Рыс	420—470	400—420	400—430	460—490
Манныя крупы	460	460	400—500	400
Проса	300	330	360	360
Цукар	540	550	540	540
Мёд	3.300	4.000	3.600	4.000

ВАЛЮТА НА "ЧОРНЫМ" РЫНКУ (руб.)

	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж
1 долар ЗША	1100	1200	1100	1250	1100	1200	1100	1200
1 дойчмарка	470	480	470	480	470	480	450	—
1 рубель Расіі	40	42	40	42	40	42	39	43

БЕЛАПАН ПОЛУЧИЛ АНОНИМНОЕ СООБЩЕНИЕ, КАСАЮЩЕЕСЯ ИСЧЕЗНОВЕНИЯ ИЗВЕСТНЫХ ЛЮДЕЙ

20 ноября информационная компания БелаПАН получила по электронной почте анонимное письмо с изложением информации, имеющей отношение к делу об исчезновении в Беларуси известных людей.

Автор письма утверждает, что является офицером Комитета государственной безопасности Беларуси и основывает приводимые данные на материалах уголовного дела, возбужденного по факту исчезновения 7 июля 2000 года оператора ОРТ Дмитрия Завадского. Электронное письмо, пришедшее в БелаПАН, было отправлено с бесплатного электронного почтового ящика, находящегося на сервере yahoo.com.

В нем, в частности, сообщается, что по этому делу арестованы 9 человек, 5 из которых являются офицерами спецслужб. По утверждению анонима, подследственные признались в убийстве Дмитрия Завадского и указали место захоронения. На органы следствия, пишет аноним, оказывается давление: следственной группе до сих пор "не дали" провести эксгумацию тела, а два следователя были избиты неизвестными. Преступная группа, задержанная по "делу Завадского", как говорится далее в письме, имела прямое отношение также к исчезновению и убийству оппозиционного политика Виктора Гончара.

В правоохранительных органах сдержанно комментируют факт появления такого письма, подчеркивая несоответствие действительности ряда изложенных в нем моментов. В частности, как заявил БелаПАН начальник управления по борьбе с организованной преступностью и коррупцией Прокуратуры Беларуси Виктор Морозов, содержание письма "по ряду моментов не соответствует действительности". "Это непонятный текст", - сказал он и посоветовал передать его для проверки правоохранительным органам, которые занимаются расследованием обстоятельств исчезновения Дмитрия Завадского. Не уточняя число задержанных по данному делу, Виктор Морозов в то же время сообщил, что некоторым из них уже предъявлено обвинение; следствие продолжается. Пресс-секретарь министра внутренних дел Дмитрий Партон опроверг содержащееся в письме заявление о том, что дело об исчезновении оператора ОРТ передано из республиканской прокуратуры в МВД. В то же время он подтвердил, что один из задержанных по "делу Завадского" - бывший сотрудник спецподразделения "Алмаз".

Мы приводим полный текст этого письма. Обращаем внимание на то, что изложенные в нем факты не подтверждаются официальными источниками. О развитии событий БелаПАН будет сообщать по мере поступления информации.

Полный текст электронного письма, полученного информационной компанией БелаПАН 20 ноября от анонимного источника:

"Я офицер Комитета Государственной Безопасности Республики Беларусь. По целому ряду обстоятельств не могу сообщить свою фамилию и должность, которую занимаю. Информация, которую я хочу сообщить, общественно значима. От того, как скоро она станет достоянием гласности, зависит жизнь и будущее многих людей.

К сожалению, я ограничен в изложении фактов, так как к материалам дела имеет доступ ограниченное количество оперативных сотрудников и офицеров КГБ. Упоминание более уточненных данных может привести к неоправданным жертвам.

Ведение следствия по делу об исчезновении Дмитрия Завадского было поручено Генеральной прокуратуре и Комитету государственной безопасности. Факты, которые вскрывались по ходу следствия, вызвали не только давление на органы следствия со стороны Совета безопасности, но и вызвали противостояние между КГБ и Службой безопасности президента. На след группы похитителей КГБ вышел после ареста Игнатовича, бывшего офицера спецподразделения "Алмаз". Игнатович был арестован по другому делу, но сам он несколько раз был в Чечне, где воевал на стороне сепаратистов. Во время следствия Игнатович назвал ряд фамилий белорусских военнослужащих, сотрудничавших с чеченскими сепаратистами в качестве инструкторов. После их ареста подтвердилась чеченская версия следствия. По делу об исчезновении Завадского, на сегодняшний день, арестовано 9 человек. Пятеро из них являются действующими офицерами Службы безопасности президента, двое - бывшие сотрудники этой службы, один - бывший офицер спецподразделения "Алмаз", а еще двое - уроженцы Чечни.

Подследственные признались в убийстве Дмитрия Завадского и указали место в лесной зоне недалеко от Минска, где было закопано тело Завадского. В распоряжении следствия оказалась и лопата со следами (так в оригинале - БелаПАН) крови. Экспертиза выявила идентичность крови на лопате с кровью Дмитрия Завадского. Эксгумация тела Дмитрия Завадского не состоялась. Ее не дали провести следственной группе руководство Совета безопасности и лично Президент. Вместо этого в Администрацию президента были вызваны Председатель КГБ Владимир Мацкевич, Генеральный прокурор Олег Божелко и Министр внутренних дел Владимир Наумов. Президент приказал передать дело в МВД, мотивируя это тем, что следствие идет недостаточно интенсивно. На самом деле, это было сделано для того, чтобы развалить дело об исчезновении Завадского.

В ходе следствия также выяснилось, что эта преступная группа имела прямое отношение к исчезновению и убийству оппозиционного политика Виктора Гончара. В их ликвидации принимало участие 14 человек. Пятеро из них разыскивались вплоть до передачи дела в МВД. Во время следствия давление на следственную группу дошло до критической точки. Два следователя были избиты, а жену одного из них пытались изнасиловать. Но, несмотря на это, следователи продолжали работу по изобличению преступников.

Я хотел бы, чтобы семьи погибших знали - мы не звери, как некоторые пытаются нас представить. Мы сочувствуем вам и понимаем, что ничто не восполнит вашей утраты. Единственное, что в наших силах - это изобличить преступников. А если кто-то пытается этих преступников покрыть, то им самим не избежать скамьи подсудимых".

ПАВЕЛ ШЕРЕМЕТ: ИНФОРМАЦИЯ МОЖЕТ ИМЕТЬ ПОД СОБОЙ РЕАЛЬНЫЕ ОСНОВАНИЯ

Информация анонимного офицера КГБ Беларуси по делу оператора Общественного российского телевидения Дмитрий Завадского, исчезнувшего 7 июля нынешнего года, может иметь под собой реальные основания. Об этом БелаПАН заявил руководитель отдела спецпроектов ОРТ Павел Шеремет.

"О том, что Завадский был убит лопатой, нам сообщили за несколько дней до выхода фильма "Дикая охота" (8 ноября, - БелаПАН), - сказал Шеремет. - Тогда нам показалась, что это провокация, поскольку не приводилось никаких доказательств. Мы начали проверять эту версию. Нам сказали, что будто бы на самом деле ничего не нашли, будут по новой прочесывать местность, а задержанные по подозрению в убийстве сотрудники Службы безопасности президента еще не начали давать показания, поскольку это грозит расстрелом. Пока не найден труп, надежда на то, что Завадский жив, остается, но она призрачная".

"Косвенным свидетельством того, что в "деле Завадского" замешан Совет безопасности, являются события, которые развернулись весной этого года вокруг ареста директора Белгосцирка Татьяны Бондарчук, - заявил Шеремет. - По некоторым данным, она была связана с Советом безопасности, ей симпатизировал Лукашенко. Она была арестована за взятку в результате проверки, проведенной контрольно-ревизионным управлением Министерства культуры. Сотрудников этого управления вывезли в лес, одного избили до полусмерти, выбив все зубы. Теперь он узнал среди задержанных по делу Завадского тех, кто его избивал".

По словам Шеремета, в Москве внимательно следят за развитием событий вокруг исчезновения оператора ОРТ. "Подозреваемые были задержаны в основном благодаря вмешательству ФСБ России. Очень много помогает министр внутренних дел Рушайло. Лукашенко загнан в угол. Ему нужно давать на серьезные обвинения серьезные ответы, и не в духе Азаренка и сумасшедших ведущих БТ. Ситуация зашла слишком далеко. Москву это уже раздражает. Она уже созрела для того, чтобы видеть на политическом поле Беларуси новых лидеров".

АНОНИМНОЕ СООБЩЕНИЕ В СОВЕТЕ БЕЗОПАСНОСТИ БЕЛАРУСИ СЧИТАЮТ "ЧИСТЕЙШЕЙ ВОДЫ ПРОВОКАЦИЕЙ"

Сообщение анонимного автора об обстоятельствах исчезновения оператора ОРТ Дмитрия Завадского и обстоятельствах расследования этого уголовного дела является "чистейшей воды провокацией", заявили БелаПАН в пресс-центре Государственного секретариата Совета безопасности Беларуси. Речь идет об электронном письме, полученном 20 ноября компанией БелаПАН и некоторыми другими средствами массовой информации Беларуси с бесплатного электронного почтового ящика, находящегося на сервере yahoo.com.

По мнению работников пресс-центра, стиль сообщения указывает на то, что оно было подготовлено человеком, не являющимся сотрудником КГБ Беларуси. В пресс-центре обратили внимание на ряд неточностей в этом письме. Так, его автор сначала говорит, что "по делу об исчезновении Завадского на сегодняшний день арестовано 9 человек", а несколькими строками ниже, перечисляя арестованных, называет уже десять. Кроме того, автор сообщения именует Прокуратуру Республики Беларусь Генеральной прокуратурой -.так, как эта структура называется в Российской Федерации.

БелаПАН.

● *КОНКУРС*

"САМАЯ ОБАЯТЕЛЬНАЯ И ПРИВЛЕКАТЕЛЬНАЯ"



ЕЛЕНА, по гороскопу — Стрелец.

Слушаю самую разную музыку, люблю общаться с друзьями, любимая группа "Scorpions", а музыка — зарубежная.

Нравятся парни без вредных привычек, с чувством юмора, спортивного телосложения.

☎ *АЛЁ, РЭДАКЦЫЯ?*

"Дошкі для падлогі Зінаіды Фомінічны яшчэ сохнуць..."

— "Газета для вас"? Хачу паскардзіцца на старонках вашага выдання на кіраўніцтва нашага калгаса. Справа ў тым, што згніла падлога ў маёй хаце, грыбок зусім з'еў. Я — старая жанчына, усе жыццё працавала ў калгасе цялятніцай, паляводам, дзеці мае дапамагалі калгасу. А зараз па хаце не магу прайсці. Старшыня калгаса нічога канкрэтнага не кажа. Як мне падаецца, ён увогуле нічым дапамагаць не збіраецца.

Зінаіда АНДРЭЙЧЫК,
г. Косава Івацэвіцкага раёна.

На пытанне Зінаіды Фамінічны адказвае старшыня калгаса "Косава" Віктар ЛУКАШЭВІЧ:

— Не згодзен з тым, што нас не цікавіць лёс тых, хто ўсё жыццё адпрацаваў у калгасе. Ведаем аб тым, якая праблема ў сям'і Андрэйчыкаў. Зразумейце, што піламатэрыялы, калі яны яшчэ сырыя, не падыходзяць для таго, каб імі ўсцілаць падлогу. Трэба час, трэба пачакаць, калі яны поўнасцю высахнуць, тады прымемся за работу.

"...Наш старшыня сам на могілкі не збіраецца?"

— Тэлефануем вам з вёскі Даманава Івацэвіцкага раёна. Хочам расказаць аб той непрыгожай сітуацыі, якая склалася вакол нашых вясковых могілак. Яны з трох бакоў загароджаны, з чацвёртай — не. На тым полі, што падступае да могілак, пасуць калгасных кароў, не заўсёды, самі разумееце, пастух можа стрымаць статак — і, як след, каровы ходзяць па могілках. Можаце ўявіць, што можа нарабіць велізарны статак кароў на такім месцы, многія свежыя магілы растаптаны, вянкі раскіданы. Каровы ж ходзяць, дзе папала.

Працы за ўсё было б зрабіць агароджу вакол могілак. Ці, калі ўжо да гэтага рукі не даходзяць, перапрафіліраваць поле пад іншыя культуры, пасадзіць б кукурузу — то сітуацыя была б іншай.

Звярталіся да старшыні калгаса, сельсавета — ніхто слухаць не хоча. Ініцыятыву мог бы узяць у рукі старшыня калгаса, тым больш, што калгасныя магчымасці больш вялікія, чым сельсавета. Дарэчы, старшыня сельсавета ўжо прызначаў сустрэчу старшыні калгаса, але апошні на яе не з'явіўся. Няўжо наш старшыня сам на могілкі не збіраецца?

М. Т., вёска Даманава
Івацэвіцкага раёна.

Вось адказ старшыні калгаса "Даманава" Валерыя МЕЛЯШКЕВІЧА:

— Тое, што праблема з агароджваннем могілак існуе, я цудоўна ведаю. Патлумачу, чаму мы пакінулі на тым полі траву — добры травастой там.

Як мне падаецца, да гэтай праблемы трэба падыходзіць больш гібка. Сёння наш калгас не мае сродкаў і сіл, каб узяць на сябе гэтую ношу. Хоць са свайго боку, калі гаварыць канкрэтна, я абяцаю даць слупкоў для агароджы. Няхай падключацца сельскі Савет, насельніцтва вёскі — і разам гэтую праблему вырашыць можна.



(Працяг. Пачатак у №№ 26—32, 34, 35, 37, 42, 45, 46).

XII. З ВЁСКІ ВОГНЕННАЙ

13.

Як жа склаўся лёс Іванкі, самага малодшага з сям'і Слесарчукоў з вогненнай вёскі Бабровічы?

Рос Ваня Слесарчук даволі слабым, часта хварэў, але маці, сёстры і брат Раман усё рабілі, каб падтрымаць яго, абараніць ад розных хвароб, падлячыць яго. І трэба сказаць, што Ваня, чым больш рос, тым больш мужнеў. Добра вучыўся ў школе. Усё ў яго атрымлівалася. Ён адзіны з сям'і, хто закончыў дзесяцігодку.

Неяк у газеце прачытаў, што ў Казахстане ёсць вучылішча, дзе рыхтуюць сантэхнікаў.

— Каго не пытаў, ніхто не ведаў, што гэта за спецыяльнасць, — прызнаецца сёння Іван Якаўлевіч. — Няблізкі свет Казахстан, але паехаў туды, хаця маці не згаджалася. Аказалася, што па выбранай спецыяльнасці не набралася групы і мяне залічылі ў электразваршчыкі. Закончыў вучобу і адразу прызвалі ў армію...

Праходзіў службу ў Алма-Аце. Менавіта тут з Ванем здарылася бяда. У час зварачных работ адбылося нечаканае замыканне электраправадоў, і ён цудам застаўся жывым, бо падаспелі салдаты, што знаходзіліся побач. Іван Слесарчук трапіў у шпіталь і там лячыўся не адзін дзень ад электрычных апёкаў. А ўказальны палец на правай руцэ ўсё ж прыйшлося ампутаваць.



Іван Якаўлевіч Слесарчук (справа) з сынам Генам (верасень 2000 г.).

Пра здарэнне з Іванам даведаліся ў Бабровічах (а гэта было летам 1960 года). Маці не магла знайсці сабе месца. Сабралі сямейную нараду і рашылі: паедзе ў Алма-Ату Марыя. Трэба ж даведацца ўсё пра Івана.

— Яшчэ малой я ездзіла на Украіну, — кажа Марыя Якаўлеўна, — таму ў мяне быў нейкі вопыт. Заехала ў Алма-Ату, з дапамогай добрых людзей знайшла ваенны шпіталь, там сустрэлася з братам. У яго была забінтавана рука. Ваня вельмі здзівіўся, што я дабралася сюды, так далёка ад дому, але неймаверна быў рады сустрэчы. Дамашнія ласункі вельмі спадабаліся яму. Але галоўнае, я пабачыла, што ён жывы і амаль здаровы. Аб гэтым і расказала ўсім сваім, прыехаўшы дамоў.

14.

У тым жа годзе Іван Слесарчук вярнуўся з арміі. Уладкаваўся на работу на Бярозаўскую ГРЭС, дзе ўжо працаваў ягоны брат Васіль. Дарэчы, Васіль Якаўлевіч асвоіў спецыяльнасць газаэлектразваршчыка і ўсё жыццё, да самай пенсіі, меў справу з агнём і жалезам. Зараз на пенсіі, жыве ў горадзе энергетыкаў. Разам з жонкай Ганнай Рыгораўнай выгадавалі два сыны. Яны ўжо дарослыя і жывуць асобна.

Не вельмі доўга затрымаўся Іван у Белаазёрску — працаваў зваршчыкам і завочна вучыўся ў Мінскім педагагічным універсітэце. Атрымаўшы дыплом гісторыка, перайшоў на педагагічную работу. Спярша настаўнічаў у Здзітаўскай СШ. Жаніўся і пераехаў у вёску Лясковічы, што на Бярозаўшчыне. І вось ужо 23 гады разам з жонкай Таццянай Сцяпанаўнай жывуць тут і працуюць у школе. Трое дзяцей у сям'і — сын і дзве дачкі. Сын Гена ўжо закончыў універсітэт, атрымаў дыплом эканаміста і пакуль што без работы. Ні ў Бярозе, ні ў Брэсце такія спецыялісты чамусьці не ў дэфіцыце. А Оля і Ніна яшчэ займаюцца ў вышэйшых навучальных установах.

— Сельскаму настаўніку зараз жывецца цяжкавата, — з сумам гаворыць Іван Якаўлевіч. — Работы шмат, а зарплата невялікая. Замест таго, каб рыхтавацца да ўрокаў, прыходзіцца займацца ўласнай гаспадаркай. Інакш не пражывеш. Вось так усё жыццё змагаемся за выжыванне...

15.

Акрамя сям'і Слесарчукоў, якім удалося вырвацца з вогненнай вёскі і пра якіх расказана вышэй, выратаваліся і іншыя жыхары Бабровічаў. Расказвае **Вольга Рыгораўна Петруковіч**, залоўка Настассі Якаўлеўны Дубінкі:

— Мне тады было 14 гадоў. Помню той жудасны дзень. Тату расстралялі з усімі мужыкамі днём раней. А ў нядзелю карнікі прыехалі за нашымі душамі. Зганялі жанок і дзяцей то ў клуні, то ў хаты, стралялі і палілі. Хто паспеў схавацца ці ўцячы, то і застаўся. Я трапіла ў клуню з нашымі бабамі і дзецьмі. Усім загадалі стаць на калені і маліцца. Я не схацела станавіцца, то мяне паліцай так таўкнуў, што я вымушана была прызямліцца. Прысела сярод іншых і сабе думаю, як толькі пачнуць страляць, адразу ўпаду. Можа, не пападуць. Як стрэльнулі першы раз, я ўпала на зямлю. Страчылі яшчэ і яшчэ. Хтосьці наваліўся на мяне, храпучы. І на мяне пацякла чыясьці кроў. Цёплая. Немцы пабілі ўсіх, але клуню чамусьці не падпальвалі, і падаліся далей па вёсцы. Я пачакала трохі і прыпаднялa галаву. Вакол ляжалі ўсе забітыя, чалавек трыццаць. Я вылезла з-пад трупаў, уся ў крыві, але нават непараненая і паўз агароды заспяшалася да сваёй хаты. А дома ўжо гаспадарылі немцы. Усіх паставілі да сцяны на расстрэл. Убачыўшы мяне, таксама ўпіхнулі ў той гурт. "Ужо не ўдасца выратавацца, — думала пра сябе. Але ж тактыку выбрала тую ж...".



Вольга Рыгораўна Петруковіч (1975 г.).

16.

"Я ўпала з першым стрэлам і адразу адчула, як кроў цячэ па шыі і макрэ кашуля. Не ведаю, колькі ляжала, але чула, як ужо стралялі далей ад нашай хаты. А прымусіла мяне адпаўзці з двара гарачыня — гарэлі хлеў і хата. Я запаўзла на агарод і скацілася ў глыбокую разору. Там мяне і знайшлі маці і брат Іван. Яны пасвілі кароў і засталіся жывымі.

"Іванка, прыкапай мяне, — папрасіла я брата, — усё роўна мне не жыць". Ён і прыкапаў мяне трохі. Потым, праўда, мяне маці забрала. Перавязала шыю. Куля навылёт прайшла, але галоўную вену не пашкодзіла. Затое пашкодзіла нейкі нерв і больш за месяц правая рука ў мяне была як нежывая. Шкіпінару маці дастала і ўвесь час расцірала, і яна, слава Богу, палепшала..."

З сям'і Дубінкаў засталіся жывымі маці, дачка Оля, якую двойчы расстрэльвалі, і сын Іван. Ён потым узяў сабе ў жонкі Насцю Слесарчук. Пра яе расказана вышэй. А Оля выйшла замуж за Уладзіміра Петруковіча. У сям'і было чацвёра дзяцей — тры сыны і дачка. Як Насця і Марыя, Вольга таксама ўдава. Год таму памёр муж.

Яшчэ пра адну дэталь з жыцця сям'і Дубінкаў хачацца сказаць. Летам 1944 года, калі маці з дачкой і сынам вярнуліся ў Бабровічы, на папялішчы, а іменна там, дзе стаяла іхняя хата, выраслі дзве тоненькія бярозкі, адна ля адной, нібы хацелі за рукі ўзяцца. "Хай растуць, — сказала тады Оля, — гэта будзе памяць пра дзеда і бабу, якія загінулі".

Сёння ўжо гэта тоўстыя высокія дрэвы. Ля іх зроблены столік і лаўкі. Часта адпачываюць тут дзеці, унукі і праўнукі былых гаспадароў даваенных пабудоў.

17.

Той нядзельны дзень — 13 верасня 1942 года — добра запомніў і жыхар Бабровічаў **Сяргей Аляксандравіч Чырко**.



Сям'я Івана Якаўлевіча Слесарчука (1988 г.).



Сяргей Аляксандравіч Чырко (1978 г.).

— Мне тады было 12 гадоў. Зранку я пасвіў кароў. Ужо каля апоўдня ўбачыў, што ў вёсцы нешта гарыць, чуюцца выстралы. Думаю збегаю і пабачу, што ж там робіцца. У сяло мяне пусцілі. Ля другой хаты нейкая баба, не помню яе прозвішча, накінулася на мяне: "Куды ж ты прэшся, хлопчэ, дзярэўню немцы паляць, людзей б'юць. Уцякай, пакуль жывы..."

Я адразу на агарод, а там разорамі папоўз да лесу. За мной увязаліся дзве дзяўчынкі, маладзейшыя за мяне. Таксама паўзуць. Падняў я галаву, агледзеўся — нікога не відно. Думаю — пабягу. Падняўся і даў драла напрасткі да лесу. А за мной — дзве тыя дзяўчыны. І тут пачуліся выстралы. Але ні я, ні дзяўчынкі не спыніліся. Канешне, рызыкавалі. Кулі свісталі побач — зверху, збоку, упіваліся ў зямлю, а мы беглі. Толькі ў лесе пападалі на зямлю, бо ўжо сілы не хапала бегчы. І самі здзівіліся — нікога кулі не зачапілі. Значыць, пашанцавала...

Такі вывад зрабіў Сяргей Аляксандравіч. Калі прабіраліся тады па ўскрайку балота да возера, уцекачоў зноў абстралялі немцы. Прыйшлося ўглыбіцца ў балота і да возера прабраліся праз хмызняк. Залезлі ў густы чарот ля берага і ў вадзе прасядзелі да самага ранку. А раніцай на траве быў белы мароз. Перабраліся праз балота на грудок, дзе стаялі копы сена. Адну капу трохі рассунулі, панакрывалі ногі і сядзелі, каб сагрэцца. Пазней да Сяргея і дзяўчатак далучыліся пастухі. Яны далі па кавалку хлеба, а самі падаліся да спаленай Красніцы, каб пашукаць што-небудзь з ежы. У той капе сярод балота Сяргей з дзяўчаткамі і пастухамі пераначаваў.

Святаслаў КАЖАДУБ.

Івацэвіцкі і Бярозаўскі раёны.

(Працяг будзе).



Васіль Якаўлевіч Слесарчук, яго жонка Ганна Рыгораўна і Марыя Якаўлеўна Мордус (верасень 2000 г.).

Великий оратор

И никто, по пути идя,
Не ищи из людей
вождя.
Все герои, которых
чтут
Душу вечную
не спасут.
Есть один у нас
Вождь — Герой
Он за душу стоит
горой.
Он за нас Свою
жизнь принёс,
Ему имя
Иисус Христос.

В. А. ЛОБАНОВСКИЙ.

Смотря сквозь толщу минувших веков, интересно наблюдать, как зарождалось ораторское искусство. Его развитие принесло глобальные перемены в обществе, оказав неповторимое влияние на культуру того времени. Оно дало возможность глубже проникнуть в тайники родного языка, улучшить культуру речи и красноречие. Риторика, как это принято теперь называть, пролила свет на многие, доселе неизвестные, интеллектуальные возможности, позволив мыслящему человеку расширить кругозор своих знаний. Вследствие на протяжении многих столетий, вплоть до нашего времени, восставало множество великих риторов, в совершенстве владеющих ораторским искусством. Каждый из них внёс свой вклад в литературное творчество и жизнь народа, по-особенному оказав влияние на историю. Во многом мы им благодарны, но, тем не менее, столь потрясающий успех ни коим образом не отразился в моральном облике человека.

Выдающиеся умы, знаменитости, достигнув "высшего пилотажа" в красноречии, почему-то начинали преследовать личностные цели, или просто строить свой мир, собственную империю. Поначалу всё выглядело шикарно, помпезно и триумфально, народ приветствовал нового вождя, но проходил какой-то период времени, и всё рушилось как карточный домик. Ослепительные огни славы гасли, величье умалялось, верные друзья предавали, и былые времена оставались лишь историей.

Но миру известен один на самом деле великий оратор — это Иисус Христос. Пред ним меркнут все самые велеречивые герои. Почему? Ведь Он такой же, как и все. Да, это так, но лишь на первый взгляд, потому что Христос сделал то, что не было под силу никому — Он изменил мир, Он достиг цели своей жизни!

Наиболее отличительной чертой Иисуса, как оратора, является его сверхъестественная власть над словом. Библия говорит: "...Он учил как власть имеющий, а не как книжники и фарисеи" (Матф. 7:28-29). Т. е. если Христос говорил: "Я Бог", то Он и поступал как Бог, с тою же властью повелевая умолкнуть ветру и буре, приказывая бесам выйти из человека, превращая воду в вино и насыщая тысячи изголодавшихся пятью хлебами и двумя рыбками.

Потрясающим было также и то, что никто не мог противостать Его мудрости. Отвечая на самые изощрённые вопросы лукавых людей, Иисус приводил в молчание риторов и в безвыходность интеллектуалов того времени: "...фарисеи услышали, что Он привел саддукеев в молчание... И никто не



мог отвечать Ему ни слова; и с того дня никто уже не смел спрашивать Его" (Матф. 22:34,46).

Безусловно, речь Иисуса Христа приводила людей в восторг, она была очень грамотна, логически построена и высоконравственна, факты же, приводимые Им, были всегда вески и убедительны. Но меня восхищает другая сторона медали. Иисус был исполнителем Своего морального закона, который он излагал в проповедях. Его моральный закон — это закон любви. Желая спасти человечество от закона смерти, Он настолько сильно возлюбил мир (как ни один пресловутый вождь народа) отдав себя в жертву за его грехи. Столь великую цену посвящения смог заплатить лишь только Бог. Этим поступком Он доказал силу и истинность Своего Слова. И Христос не просто оратор, Он — Великий оратор.

